**Федарэнка, Т. А. Асновы інтэграцыя навучання студэнтаў аддзялення алігафрэнапедагогікі працы і выяўленчай дзейнасці з методыкай выкладання / Т. А. Федарэнка, У. А. Шынкарэнка // Інтэграцыйныя тэндэнцыі ва ўдасканаленні падрыхтоўкі студэнтаў-дэфектолагаў ва ўмовах нацыянальнага адраджэння : зб. матэр. рэспуб. канф., г. Мінск, 15-16 снежня 1992 г. – Мінск : МПІ ім. А. М. Горкага, 1993. – С. 56–57.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Т.А.Федарэнка, У.А.Шынкарэнка

## Асновы інтэграцыі навучання студэнтаў аддзялення алігафрэнапедагогікі працы і выяўленчай дзейнасці з методыкай выкладання

Інтэграцыя дысцыплін "Праца з методыкай выкладання" і "Вы-



яўленчая дзейнасць з методыкай выкладання" ажыццяўляецца ў мэтах рацыянальнага выкарыстання вучэбнага часу і павышэння якасці выкладання.

Магчымасці інтэграцыі гэтых дысцыплін вызначаюцца шэрагам аб'ектыўных абставін:

- некаторыя віды работы (розныя віды аплікацыі, лепкі) традыцыйна выкарыстоўваюцца і на занятках па працы, і на занятках па выяўленчай дзейнасці, гэта прадугледжана і ў школьных, і ў інстытуцкіх праграмах;

- большасць вырабаў, якія і школьнікі, і студэнты выконваюць на занятках па працы, незалежна ад іх складанасці павінна мець мастацкае афармленне;

- апошнім часам і ў школе, і ва ВНУ усё шырэй выкарыстоўваюцца розныя віды мастацкай працы (мазаіка, графіка па тушы і інш.); распрацаваны праграмы, у якіх вызначаецца змест пазакласных заняткаў па мастацкай працы ў школах і класах для дзяцей з недахопамі ў разумовым і фізічным развіцці; для I-IУ класаў дапаможнай школы распрацавана праграма урокаў мастацкай працы;

- структура і методыка правядзення урокаў працоўнага навучання і выяўленчай дзейнасці ў малодшых класах дапаможнай школы мае агульныя рысы.

Гэтымі абставінамі вызначаецца не толькі магчымасць, але і неабходнасць інтэграцыі навучання студэнтаў як працы і выяўленчай дзейнасці, так і методыкам іх выкладання. У перспектыве з'яўляецца магчымасць уключэння ў інстытуцкі вучэбны план інтэграванай дысцыпліны "Мастацкая праца з методыкай выкладання". У бліжэйшы час плануецца узмацніць падрыхтоўку студэнтаў да правядзення ў дапаможнай школе заняткаў па мастацкай працы праз увядзенне адпаведнага спецкурса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ